# КРЫВІЯ

**Выданьне беларускае дыяспары ў Чэхіі**

**№17 Студзень - Красавік 2010**

**Культурна-асьветніцкая газэта**

## З Ь М Е С Т

**Беларуская Чэхія**
Зварот у справе Ларысы Геніюш - ст. **1**
Віртуальная Прастора Беларусаў - ст. **2**
Найпрыгажэйшая песьня... - ст. **2**
Прэсавы рэліз
“Маладога Адраджэньня” - ст. **3**
Конкурс на эскіз- ст. **3**
Адзначаньне Дня Волі - ст. **4**

**Пагляды, разважаньні**
Шлях у Прагу... - ст. **5**

**Навіны з Бацькаўшчыны**
Адукацыйная праграма БХД - ст. **7**
МСЗ і справа візаў - ст. **7**
10 год, як беларускамоўныя... - ст. **8**
Новае кіраўніцтва
Маладога Фронту - ст. **9**
Ці дапаможа суд? - ст. **9**
Разагнаньне акцыі Сьв. Валянціна - ст. **9**
БАПЦ за рэабілітацыю Л. Геніюш - ст. **10**
Саньнікаў на выбары - ст. **10**
Інтэрв’ю з Тацьцянай Шапуцька - ст. **10**
Дзень Волі ў Беларусі - ст. **12**

**Беларусы Эўразьвязу**
Ахвяравалі, каб жыла... - ст. **12**
Ушанавалі памяць Кастуся
Каліноўскага - ст. **13**
Дапаможам Сяргею Вітушку! - ст. **14**

**Беларусы ў сьвеце**
125 гарадоў за Беларусь - ст. **15**
Пасланьне старшыні Рады БНР- ст. **15**
Уладзімер Арлоў - лаўрэат - ст. **16**

**Спорт** - ст. **16**

## Беларуская Чэхія

### Зварот да міністра юстыцыі Чэхіі ў справе Ларысы Геніюш

**З нагоды 100-гадовага юбілею славутай беларускай пісьменьніцы Ларысы Геніюш, які адзначаецца ў гэтым годзе, прадстаўніцы беларускай суполкі “Скарына” (Прага, Чэхія) – Рыта Гаціх, Алена Каварава і Вольга Дудко – 5 лютага зьвярнуліся з сымбалічнай просьбай да міністра юстыцыі Чэскай Рэспублікі Даніэлы Каваравай (Daniela Kovářová).**

Беларускія жанчыны просяць спадарыню міністра адмяніць рашэньне суда ў Піску, згодна з якім сям’ю Геніюш дэпартавалі за межы Чэхаславацкай рэспублікі. Заява была прыхільна сустрэта спадаром Росыпалем (Rosypal), памочнікам Даніэлы Каваравай.

“*Наша ідэя ў тым, што жанчыны прыйшлі прасіць жанчыну за жанчыну,* – гаворыць старшыня суполкі “Скарына” **Рыта Гаціх**. – *Спадзяемся, што як жанчына спадарыня Каварава станоўча паставіцца да нашай просьбы.*” Акрамя таго, беларусы Чэхіі плянуюць да юбілею пісьменьніцы ўсталяваць памятную дошку ў яе гонар на будынку, у якім Ларыса Геніюш пражывала пад час свайго легальнага знаходжаньня ў Чэхаславацкай рэспубліцы. Неўзабаве будзе абвешчаны конкурс на праект гэтай дошкі. У дадзены момант сябрамі нядаўна створанага ў Менску арганізацыйнага камітэту па сьвяткаваньні 100-годзьдзя з дня нараджэньня **Ларысы Геніюш** узгадняецца тэкст, які будзе напісаны на мемарыяльнай дошцы. Арганізацыйную дамапогу ў рэалізацыі праекту па ўсталяваньні памятнай дошкі Ларысе Геніюш аказвае МГА “Згуртаваньне беларусаў свету “Бацькаўшчына”, паведамляе Zbsb. org.

**Крыніца:** Радыё Рацыя, люты 2010

## Культурная імпрэза


Крылаты гусар
з войска Мікалая Радзівіла Рудога

У суботу 30-га студзеня 2010 г. у Бібліятэцы адбылося ушанаваньне

**Нацыянальнага Сьвята Перамогі 1564 г. на рацэ Вулла**

**Праграма імпрэзы** складалася з

- дакладаў сяброў Сьвятаслава Ліпеня й Максіма Пілюціка.
- Працяг дыскусіяў на тэму вечара ды актульных грамадзкіх пытаньняў адбыўся ў блізкім рэстаране.

## http://belkvartal.org = віртуальная прастора беларусаў у Чэхіі

Наведвайце новы сайт нашае грамады !

У разьдзеле **БІБЛІЯТЭКА** знойдзеце:

- Каталог кніжак нашай бібліятэкі,
- Архіў часапісу КРЫВІЯ, нумары 10 - 17.
- Дапаможнікі для беларускіх школаў і хатняга навучаньня :

- Беларуская Мова, Правапіс, Чытанкі, Граматыка

- Гісторыя Беларусі

У іншых разьдзелах даведаецеся пра найнавейшыя падзеі з жыцьця беларускае грамады Чэхіі.

## Аляксандр Рыбак: Найпрыгажэйшая песьня ў сьвеце

Пераможца конкурсу песьні "Эўравізія-2009" нарвэжац беларускага паходжаньня Аляксандар Рыбак 25 лютага выступіў з канцэртам у Празе.Канцэрт Рыбака сабраў поўную залю музычнага бару Lucerna ў цэнтры Прагі.




Герой леташняй "Эўравізіі", у гутарцы з аўдыторыяй падчас канцэрту паведаміў, што "Купалінка", якую яму ў дзяцінстве сьпявала маці – найпрыгажэйшая песьня з усіх, якія яму толькі даводзілася чуць.

**Крыніца:** Радыё Свабода, 25 лютага 2010.

## Пра Квартал

Здаўна людзі, якія з розных прычынаў жылі на чужыне, імкнуліся трымацца разам са сваімі землякамі. Так у гарадох ўтвараліся асобныя кварталы, дзе жылі вышлыя з аднаго краю. Так, напрыклад, у Празе вуліца "Влашская" нагадвае пра тое, што ў 16 ст.тут жылі італійскія майстры і мастакі, а вуліца "Нямецкая" ў Вільні ўзьнікла ад калоніі нямецкіх гандляроў, якія пасяліліся там у часы ВКЛ.

Беларусаў ў Чэхіі хапіла-б на цэлае мястэчка, але яны раскіданыя па розных раёнах розных гарадоў, і ня ведаюць адзін аднаго. З мэтай каб неяк сабраць беларусаў Чэхіі у адным месцы, хоць і віртуальным, і быў створаны наш Беларускі Квартал. Тут мы можам сустракацца, абмяркоўваць падзеі, прасіць парады, дзяліцца навінамі і ўражаньнямі.

Стаць жыхаром Беларускага Кварталу і ўдзельнічаць у ягонай разбудове можа кожны. Для гэтага дастаткова проста зарэгістравацца на сайце http://belkvartal.org

Запрашаем Вас таксама наведаць месца, якое вы сапраўды знойдзеце на мапе Прагі - Беларускую Клюбоўню і Бібліятэку. Знаходзіцца яна на адрасе: **Ostrovského 253/3 пакой 699.**



# Прэсавы рэліз Моладзевага Руху Беларускага Народнага Фронту "Маладое Адраджэньне"

14 лютага ў Празе адбылася **Акцыя салідарнасьці** зь лідэрамі дэмакратычнае моладзі Беларусі, рэпрэсаванымі рэжымам незаконнага кіраўніка выканаўчае ўлады Аляксандра Лукашэнкі.

Акцыю салідарнасьці на Вацлаўскай плошчы ў Празе правялі актывісты Моладзевага Руху Беларускага Народнага Фронту "Маладое Адраджэньне". Маладыя прыхільнікі Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі - БНФ трымалі фотаздымкі **намесьніцы старшыні Маладога Фронту Тацьцяны Шапуцькі і каардынатара грамадзянскае кампаніі "Эўрапейская Беларусь" Аўгена Афнагеля,** аздобленыя выявамі сэрцаў, ды плякаты з тэкстамі: "Спыніць палітычны тэрор і выключаньні студэнтаў у Беларусі!" і "Малады Фронт! Мы з табой!"

. На акцыі былі прысутныя адмысловы карэспандэнт чэскага інфармацыйнага агенцтва ČTK і рэдактар беларускіх выданьняў "Belarusian Review" ды "Крывія" спадар Юрка Станкевіч.

Старшыня Моладзевага Руху Беларускага Народнага Фронту "Маладое Адраджэньне" Раман Кавальчук распавёў прысутным пра гісторыю менскіх шэсьцяў у Дзень Сьвятога Валянціна, у якіх ён браў удзел да 2002 году.

"Маладое Адраджэньне" з 14 лютага пачынае збор подпісаў сярод ведамых палітыкаў, студэнтаў ды актывістаў моладзевых арганізацыяў у Чэхіі, Польшчы, Харватыі, Бэльгіі, Нідэрляндах, краінах Балтыі ды Скандынавіі пад заявай да ўладаў Беларусі з патрабаваньнем аднаўленьня на праўніцкім факультэце Беларускага Дзяржаўнага Ўнівэрсітэту намесьніцы старшыні Маладога Фронту Тацьцяны Шапуцькі і спыненьня брутальных рэпрэсіяў супраць беларускай дэмакратычнай моладзі.




## Абвяшчаецца конкурс на лепшы эскіз дошкі ў гонар Ларысы Геніюш

МГА "Згуртаваньне беларусаў свету "Бацькаўшчына" і суполка "Скарына" (Прага, Чэхія) у межах агргкамітэту па сьвяткаваньні 100-годзьдзя з дня нараджэньня славутай беларускай паэткі Ларысы Геніюш абвяшчаюць конкурс на лепшы эскіз памятнай шыльды ў гонар паэткі.

Шыльда будзе ўсталявана ў Празе, на доме, дзе жыла Ларыса Геніюш падчас свайго легальнага знаходжаньня ў Чэхаславацкай Рэспубліцы.

Тэкст на беларускай і чэскай мовах, які неабходна размясьціць на мемарыяльнай дошцы:

*"У поўную сілу беларускай, роўнай усім і ня ўніжанай, я была толькі ў Чэхіі…"*

*Тут ад 1943 г. жыла беларуская паэтка Ларыса Геніюш, у 1948 г. высланая ў савецкі Гулаг.*

*"Plnou měrou jsem byla Běloruskou, rovnoprávnou a neponíženou, pouze v Čechách..."*

*V tomto domě žila od r.1943 běloruská básnířka Larysa Heniuš, v r.1948 odvlečená do sovětského gulagu.*

Паводля эскізу пераможцы будзе адліта памятная дошка Ларысе Геніюш. Пераможцу конкурсу чакае паездка ў Прагу.

Конкурс эскізаў будзе доўжыцца з **10 сакавіка да 15 красавіка 2010 году**.

Эскізы дасылайце на адрас: 220012, г. Мінск, вул. Кузьмы Чорнага, 31, офіс 906, МГА "ЗБС "Бацькаўшчына" або па электронай пошце на скрынку: zbsb@tut.by.

Тэлефон для даведак: +375 17 200 70 27

**ВІНШУЕМ нашых сяброў з НАРОДЗІНАМІ!**

**у ЛЮТЫМ:**
**Сьвету Гвазьдзіцкую, Мікалая Вінакурава**

**у САКАВІКУ:**
**Ганну Васілевіч, Любу Грунькоўскую, Натальлю Ратнікаву, Юлю Гладкую, Касю Палівада, Сяргея Макарава, Юрку Станкевіча, Віталя Воранава**

**у КРАСАВІКУ:**
**Жану Віткоўскую, Кацю Навуменка, Надзю Шчарбакову**

**у ТРАЎНІ:**
**Алесю Вінакураву, Віталя Цімошчанку Андрэя Навуменку, Алеся Гладкага**

## Адзначаньне Дня Волі 2010 у Празе

адбылося ў чацьвер, 25-га сакавіка. Галоўным пунктам сьвяточнага дня была ўрачыстая акадэмія, праведзеная ўвечары ў Доме Нацыянальных Мяншыняў ( Dům Národnostních Menšin) у цэнтры Прагі.

Акадэмія пачалася прачытаньнем звароту старшыні Рады БНР, сп-ні Івонкі Сурвіллы да беларускага народу. На ст. 15 гэтага нумару КРЫВІІ зьмешчаны тэкст звароту.

Наступным пунктам былі выступы -даклады на тэму: **БНР - ейныя пачаткі й пэрспэктыва.**

Першым выступіў студэнт - гісторык **Павал Котаў,** зь вельмі зьмястоўным рэфэратам, у якім асабліва цікава й дэтальна распавёў аб дзейнасьці ўраду БНР у Празе. Урыўкі з гэтай часткі рэфэрату зьмяшчаем далей на гзтай-жа старонцы.

Студэнт **Максім Пілюцік** у наступным выступе насьвятліў некаторыя факты палітычнай рэчаіснасьці 1918 г., якія давялі да канчатковага абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Вядучы акадэміі, сп. **Віталь Цімошчанка**, тады пазнаёміў прысутную публіку (50-60 чалавек - пераважна моладзь) са сваімі разважаньнямі на тэму: **Сучасны пагляд на гістарычна-культурныя праблемы ў грамадзтве, пэрспэктывы разьвіцьця грамадзянскай супольнасьці**, і заклікаў прысутных да шырэйшае дыскусіі на гэтыя тэмы. Дыскусія, праўда, пачалася, але дзеля нястачы часу давялося яе спыніць - спадзяемся, што зможам яе працягваць на асобных культурніцкіх імпрэзах.



*канцэрт Алеся Наркевіча*

Мастацкая частка акадэміі - гэта быў у аснаўным канцэрт госьця зь Беларусі, сьпевака-барда **Алеся Наркевіча.**

Алесь прасьпяваў шэраг патрыятычных песьняў - пераважна на тэму сучаснага жыцьця ў Беларусі. Апрача сьпеву, наш госьць змог крыху паінфармаваць прысутных аб сучасных умовах жыцьця на Бацькаўшчыне - і заклікаў іх наведваць Бацькаўшчыну часьцей - асабліва ягоную родную Вялейшчыну.

Папаўдні ў чацьвер 25-га сакавіка, адбылося **традыцыйнае ускладаньне кветак** на магілах дзеячоў БНР на праскіх Альшанскіх могілках. Мясцовая грамада ўшанавала магілы прэзыдэнтаў Пятра Крэчэўскага, Васіля Захаркі, а таксама славутага опэрнага сьпевака Міхася Забэйды-Суміцкага, які жыў і памёр у Празе.

## Урыўкі з дакладу Паўла Котава

... Сьвяткаваньне ўгодак абвяшчэньня БНР былі бязумоўна галоўнай датай для Беларусаў у Празе. Асноўным арганізатарам беларускага жыцьця ў Празе была Беларуская Рада Студэнтаў. У 20-ыя гады, калі колькасьць беларускі студэнтаў была найбольшая, месцам дзе канцэнтравалася актыўнасьць быў студэнцкі дом у Празе. Студэнцкі дом, які разьмяшчаўся на Альбертаве, быў сваесаблівым грамадзка- культурным клубам да якога належала звыш трох тысяч чалавек розных нацыянальнасьцяў. Менавіта ў студэнцкім доме пачалося сьвяткаваньне 25 га сакавіка ў 1923 годзе. Вось як гэта апісвае Вінцэнт Жук-Грышкевіч (былы старшыня Рады БНР - **зацемка рэдактара**).

*... Ужо ад самага раньня вялікая студэнцкая заля была прыбрана бел-чырвона-белымі сьцягамі, а над традыцыйным надпісам на франтовай сьцяне" Ut unum omnes sunt" красавалася беларуская Пагоня. З правага боку вісела карта Беларусі, якая сталася галоўным цэнтрам увагі студэнцкага натоўпу. Каля яе і пра яе там вялі гарачыя дыскусіі зь беларусамі ня толькі расейцы, але й украінцы. Дыскусіі гэтыя выносіліся і ў іншыя пакоі й залі студэнцкага дому й навонак яго, так што Беларусь і яе межы сталіся тэмай дня ўва ўсім гэтым асяродзьдзі.*

*Ніхто не спадзяваўся, што гэта карта зробіць такую вялікую рэкляму беларускамусьвяткава ньню, негаворачы ўжо прапрапаганду наагул. Таму, калі надыйшла пятая гадзіна— пачатак акадэміі, вялічэзная заля была набіта бітком шмат нацыянальнай студэнцкай грамадой, сярод якой знаходзілася крыху й старэйшых людзей. Прывітаньні нашых прыяцеляў украінцаў, грузінаў, армян, летувісаў і іншых — спатыкаліся бурай воплескаў.*

*... Рэфэрат аб Акце 25-га Сакавіка, хоць і даўгі, быў праслуханы ў скупленай цішы зь вялікай увагай. Канцэртны адзьдзел зрабіў фурор. Білі на біс хору, з песьняў якога найбольш спадабалася простая, але вельмі ўдала згарманізаваная беларуская народная песьня "Былі ў бацькі тры сыны", рэфрэн якой "ух, я" чуўся й пазьней яшчэ доўга па студэнцкім доме з вуснаў чужынцаў. Вельмі часта гэта "ух, я" ставалася нібы прывітаньнем калегі чужынца зь беларусам пры штодзённым спатканьні.*

*... Сапраўдная навальніца, аднак, разьвярнулася пасьля акадэміі. Кожны беларус быў фармальна атакаваны пытаньнямі ды спрэчкамі на тэму*

*Беларусі гэтай шматмоўнай студэнцкай масай. Публіка фактычна не разыйшлася, а разьбіўшыся на грамадкі каля таго ці іншага беларуса, разбрылася па ўсіх закутках студэнцкага дому й вельмі заўзята дыскутавала, пакуль пазваляў час. Справа ў тым, што а гадзіне восьмай меў адбыцца беларускі канцэрт для чэскай публікі ў найбольш рэпрэзэнтацыйным памешканьні ў Празе, "Obecnét Dotě". Канцэрт гэты быў зарганізаваны прафэсарам чэскага ўнівэрсытэту Аўгенам Ляцкім у паразуменьні з чэскімі коламі й Беларускай Радай у Празе. Там звычайна зьбіралася самая праская сьмятанка. Такі публічны беларускі выступ быў фактычна тут першым і таму загадзя выклікаў нэрвовае напружаньне ў удзельнікаў. Канцэрт адчыніў уступным словам прафэсар Ляцкі. Беларускае грамадзтва аб ім малашто ведае, таму мы тут удзелім яму пару слоў. Ён быў прафэсарам расейскай літаратуры, высокацэненым у літаратурных колах. Прафэсар Ляцкі лічыў сябе беларусам і на праскім грунце ўзяўся за паважныя студыі творчасьці Купалы, Коласа й Багдановіча. Вынікам гэтага былі ягоныя артыкулы аб гэтых трох паэтах у паважных эўрапэйскіх літаратурных часапісах на францускай, а найбольш італьянскай мове. Такім чынам праф. Ляцкі быў бадай што першым літаратурным крытыкам, што пачаў знаёміць заходні літаратурны сьвет зь беларускай літаратурай. Праф. Ляцкі ў сваей уступнай прамове пазнаёміў паважную чэскую публіку з Беларусяй і яе нацыянальным адраджэньнем. Пасьля яго прамаўляў старшыня Рады БНР сьв. пам. Пётра Крэчэўскі аб Акце 25-га Сакавіка і яго значэньні для беларусаў і славянства. Беларускія народныя песьні, выкананыя студэнцкім хорам і тут спаткаліся зь вялікім сукцэсам, хоць апошні й ня выяўляўся так спантанічна, як у студэнцкім доме.*

*... З водклікаў чэскай прэсы аб беларускім канцэрце было відаць захапленьне асаблівасьцямі й арыгінальнасьцяй беларускай песьні, якімі яна адрозьнівалася ад песьняў іншых славянскіх народаў. Сьвяткаваньне 25-га Сакавіка ў Празе нарабіла многа гоману й сярод эміграцыйных кругоў і сярод чэхаў.*

... Дзесяцігодзьдзі аддзяляюць нас ад той пары, калі Прага прытуліла ў сябе беларусаў, для якіх абвешчаньне БНР ня было пустой дэкларацыяй. Вернасьць ідэалам 25 сакавіка, ідэалам свабоднай вольнай незалежнай і дэмакратычнай Беларусі, не дазваляла ім зьмірыцца з з тым становішчам у якім апынуўся тады наш край. Зьмірыцца з Беларусьсю падзеленай, зьмірыцца з Беларусьсю савецкай. Сёньня мы адзначаем 92-ыя ўгодкі БНР і ўспамінаем тых, хто прымаў удзел у гэтым вялікім і адважным чыне, успамінаем тых, хто пранёс сьвятло 25- га сакавіка праз гэтыя 92 гады. Успамінаем, ганарымся, дзякуем.

Жыве Беларусь.!!!!!!

# Пагляды, Развconfiguration

## Шлях у Прагу пачаўся з сапсаваных тармазоў...

Шлях у Прагу пачаўся з сапсаваных тармазоў у "бусе" Рамана Б., які меўся вывезьці мяне а 5-ай раніцы зь Вялейкі. Але да Маладэчненскага чыгуначнага вакзалу даехалі ў патрэбны час. Пасьля – халодная "электрычка" да Менску. У тамтэйшым "буфеце" (фактычна, галоўным "буфеце" Рэспублікі, бо тутака сходзяцца ўсе чыгункі краіны!), замест "эспрэса" налілі падфарбаванай пад каву вады. А буфетчыца сказала: "Ну што я зьдзелаю, есьлі апарат так наліваіт…" Усе астатнія кропкі грамадзкага харчаваньня чамусьці былі зачыненыя на "перазьменку"… Зьмерз як гад! Але ўратаваў хуткі ад'езд, бо ў цягніку на Прагу было цёпла, і натуральная кава, і я адзін у купэ…

Еду па Праскую вясну! Ва ўсіх сэнсах. Бо ў нас тутака вельмі ж неспрыяльна і халадна скрозь…

У Берасьці стаміла стаянка. Мяжа. І не абы што сабе мяжа, а мяжа Сусьветаў. За ёй усё іншае. І розьніцу бачыш адразу, як толькі сустракаеш (ці яны цябе сустракаюць?) польскіх мытнікаў і "стражаў гранічных"… Ды й што казаць, нават рэйкі ў нас розныя! З гэтай прычыны давялося "тырчэць" у "Берасьцейскім тупіку" больш за дзьве гадзіны. Некаму нязручнасьці, а каму й заробак… Адкуль іх набралася – па вагоне пачалі швэндацца туды-сюды прадавачкі: "водкі не желаеце, піва, дранікі, малачко, свежіе котлеткі, курочка, водзічка…" – я зачыніўся, бо спасу ад іх ня было…

І вось, а пятай раніцы – вакзал Прага. Было ціха, было цёмна, было цёпла. Ну, цёмна было па-за будынкам, а сам вакзал - як і іншыя вакзалы: шыльды, аб'явы, пасажыры (чамусьці, вельмі мала пасажыраў?)…

Машын жа, ня гледзячы на час, ужо дастаткова шмат. Прага ўхутаная лёгкай смугой і выглядае куды больш прыгожай, чымсьці на карцінках і ў тэлевізіі… І гэта на золку, яшчэ ня ськінуўшы рэшткі начы і туману!

Тунэлі, масты, скалы, на скалах – дамы і палацы, і храмы, высачэзныя шпілі сабораў, нязьлічона помнікаў – гэта тое, што ўбачыў, едучы ў машыне. А яшчэ заўважыў адну рэч, дзіўную для кожнага "саўдэпаўскага" кіроўцы – своеасаблівая манера язды: тутака, калі ты дасі якісь знак (рукой махнеш) – то бок, папросіш праехаць першым з другаснай дарогі – тыя, хто на галоўнай, бяз аніякіх саступаюць. Відавочна, машын зашмат і на другаснай дарозе можна прачакаць увесь дзень, калі рухацца выключна згодна правілаў ды знакаў (падазраю, у нас гэткай ветлівасьці не дачакаўся б, з прычыны нашае татальнае "саўковасьці").

Беларуская грамада ў Празе, кажуць, досыць вялікая, але (ведаю, што ня зьдзіўлю вас) каб зарганізавацца – то і на чужыне зрабіць гэтага не выпадае. Існуе некалькі беларускіх аб'яднаньняў-суполак, ды між сабой яны мала кантактуюць і ня маюць патрэбы адно ў адным. (Як сказаў мне адзін з тутэйшых Беларусаў – у нас што ні Беларус, то генерал. На гэта я дадам – а ў нас яшчэ вышэй цягнуць – на генералісімусаў…) Таму, каб адзначыць і адсьвяткаваць разам 25 Сакавіка – Дзень Волі, сьветлы й сьвяточны дзень для кожнага Беларуса, сабралася блізка 30-ці чалавек.

Адбылося гэта дзякуючы намаганьням шаноўнага спадара Юркі Станкевіча і ягонага маладзейшага паплечніка Віталя Цімошчанкі. (Яны найбольш актыўна апякуюцца беларускай справай, спрабуюць згуртаваць даўназнаёмых і новапрыбыўшых, ня раз прапаноўвалі іншым суполкам сумесную дзейнасьць на глебе Беларушчыны, але вынікаў вобмаль…) Былі ўскладзеныя кветкі на магілы славутых землякоў-Беларусаў: Пётры Крэчэўскага – Старшыні Рады БНР, Міхася Забэйды – Пясьняра, Васіля Захаркі – Старшыні Рады БНР. Потым адбылася “афіцыйная частка”: з прамовамі, гістарычным экскурсам, напрыканцы госьць з мэтраполіі, ваш добры/нядобры (каму як) знаёмы, прасьпяваў колькі песьняў са свайго рэпэртуару (дзеля чаго, па-сутнасьці, і быў запрошаны). На жаль, з-за абмежаванасьці часу, імпрэза падалася крыху скамканай. (Але арганізатары абяцалі ўлічыць і выправіць хібы на наступныя разы ) А ўвогуле, была добрая нагода сустрэцца, і тыя, хто пажадаў – скарысталіся ёй. Хаця, як адзначалі шмат хто з прысутных, Беларусы і па-за межамі Бацькаўшчыны застаюцца вельмі неактыўнымі і абыякавымі да лёсу краіны, да сваіх суродзічаў, нягледзячы на адсутнасьць і рэпрэсыяў, і іншых дрэнных наступстваў (а мы ўсё ськідаем на запужанасьць людзей у самой Беларусі – ня так гэта!). З размоваў ўжо па-за кантэкстам сьвяткаваньня я зразумеў, што большасьць з трапіўшых на эміграцыю, нават і не плануюць, і не жадаюць у перспектыве вярнуцца на радзіму. Прызнаюся, гэта мяне вельмі засмуціла…

Прага вельмі ўтульны й прывабны горад. Мне ён нават падаўся “мяккім”. Шпацыруючы па Месту, маеш адчуваньне лагоды й нірваны, быццам, калі ты пасьля лазьні закульваесься ў сьвежы пухнаты ложак… Жыхароў Прагі можна лічыць жыхарамі музэю, і ў нейкім сэнсе – музэйнымі экспанатамі. Калі я хадзіў па брукаваных вулачках, вуліцах, завулках і пляцах між сабораў, помнікаў, дзіўна-прыгожых будынкаў – першым і непакідаючым уражаньнем было – што гэта дэкарацыі зь нейкай дзівоснай казкі. Але караваны захопленых экскурсантаў (у японскіх - вочы дакладна былі круглейшымі за сярэднестатыстычныя эўрапейскія) пакрыху пераконвалі, што гэта УСЁ сапраўднае, захаванае й шанаванае на працягу тысячагоддзяў, не зруйнаванае мясцовымі бальшавікамі-партызанамі-камуністымі-саветамі, шматлікімі захопнікамі, што гэта адзін з найпрыгажэйшых музэяў у сьвеце, гэта Прага…

Дарэчы, столькі турыстаў я яшчэ ня бачыў. А Карлаў Мост праз Влтаву (нягледзячы на распачатую рэстаўрацыю) папросту аблеплены імі. Трошкі пацешыў заўважны кантраст настрояў ва ўзрушана-зацікаўленых слухачоў і змучана-выматаных гідаў. А яшчэ тутэйшыя Беларусы сказалі па-шчырасьці, што калі дзе і жыць Беларусу, дык гэта ў Празе. Бо людзі, Чэхі, лічы, рыхтык гэткага ж мэнталітэту, і не шавіністыя, і ня фобістыя. Працу тутака ня так складана знайсьці, мова лёгкая, бо славянская, тэмперамент і звычаі – усё падобна да нашага… (У што я не паверыў, вокамгненна параўнаўшы Менск з Прагай, і ўзгадаўшы, што ўдзень давялося трапіць у “гасподу”-карчму за суседні столік з “рускоязычнымі” турыстамі: я не ўдакладняў, зь якой менавіта яны часткі постсавецкай прасторы, але сьвіньні застаюцца сьвіньнямі ў любой сытуацыіі, што і зьвяртала агульнакарчомную ўвагу… ды ня будзем пра бруднае…) А дзяўчаты-Чэшкі, (і з гэтым я ня мог не пагадзіцца, сутыкаючыся на кожным кроку з шыкоўнымі паненкамі-пражанкамі), нават прыгажэйшыя за Беларусак (адразу выбачаюся прад РБэшнымі фэміністкамі і структурамі, якія кантралююць гендэрныя пытаньні), бо і выглядаюць жыццярадаснымі, жыццялюбнымі, жыццяпрагнымі, жыццяздольнымі, і таму больш упэўненымі і прывабнымі, ды й жывуць у цудоўнай краіне між годных, свабодных людзей… (Хаця тутака маецца шмат прэтэнзіяў і да Беларусаў-мужчынаў.) І мне гэта падалося праўдай. Аднак, канешне, аднаго-двух дзён замала, каб рабіць нейкія грунтоўныя высновы і ўвогуле, не дастаткова, каб нацешыцца казачнымі Праскімі краявідамі, напоўніцу адчуць атмасфэру прыгожай эўрапейскай краіны, наталіцца водарам камфортна-утульнага турыстычнага жыцця, прасякнуцца “Праскай Вясной”…

*Алесь Наркевіч, сакавік 2010*

## ЗАЎВАГІ рэдактара:

Перш, хочам падзякаваць Алесю за цікавы рэпартаж зь ягонага побыту ў Празе. Дарэчы, напісаў ён яго, каб быў зьмешчаны ў нашай КРЫВІІ.

Праўда, ў канцы свайго артыкулу, ён сам прызнае, што “аднаго-двух дзён замала, каб рабіць нейкя грунтоўныя высновы.” Дык, напэўна, выбачыць нам, калі зьвернем увагу на павярхоўнасьць некаторых ягоных назіраньняў - асабліва ў параграфе пра беларускую грамаду ў Празе.

**ПАПЕРШАЕ:**

*няма ў нас* некалькі суполак - прынамсі няма дзейных. Калі-б былі дзейныя, знайшлі-б спосаб кантактавацца й супрацоўнічаць. Фактычна, яшчэ 5-6 год таму існавала ў нас адна суполка, якую раскалолі недарэчныя асабістыя амбіцыі некаторых асобаў. Гэты раскол адштурхнуў шмат раней актыўных сяброў, якім, нажаль, не хапіла сілы ці ахвоты змагацца за аздараўленьне атмасфэры ў грамадзе.

Наступныя выясьненьні прызначаныя не чытачом (бо мы ўсё гэта ведаем), але ў першую чаргу нашым прыхільнікам і аднадумцам зь іншых краінаў, і добразычліўцам з Бацькаўшчыны, такім, як Алесь Н.

Пасьля расколу засталіся ў нашай грамадзе дзьве асноўныя плыні:

а) вузкая група працаўнікоў аднае міжнароднае інфрмацыйнае ўстановы. Хаця ў аснаўным яны праводзяць дзейнасьць карысную Беларусі, але, будучы матар’яльна забясьпечанымі, не адчуваюць патрэбы ангажавацца ў жыцьці беларускае грамады ( прынамсі бальшыня зь іх).

Да гэтай-жа плыні можна залічыць малую групку вельмі актыўных асобаў, якія таксама ня цікавяцца грамадзкай працай, але, дзякуючы добрым кантактам зь некаторымі нашымі шчырымі прыхільнікамі сярод чэскіх палітыкаў ( прыкл. былы прэзыдэнт Гавэл, сэнатар Румль...) здолелі прыцягнуць у Чэхію даволі шмат беларускіх студэнтаў, а раней і розных стажыстаў зь Беларусі на каротка-трывалыя побыты.

б) Другая плынь - гэта г.зв. беларуская грамада. Да яе сёньня належаць незалежныя прадпрымальнікі й беларускія студэнты. Яшчэ нядаўна з намі супрацоўнічалі стажысты зь Беларусі - асабліва ў галіне школьніцтва.

На працягу апошніх 5-6 год яны праводзілі бальшыню беларускае грамадзкае працы ў Чэхіі:

* заснавалі й утрымоўвалі грамадзкі цэнтар - клюбоўню.
* утрымоўвалі адзіную беларускую бібліятэку ў Празе

* дагэтуль намагаюцца весьці беларускае школьніцтва, навучаючы дзетак родную мову й гісторыю

* выдавалі квартальнік КРЫВІЯ ( дагэтуль выйшла 17 нумароў)

* ладзілі культурныя імпрэзы, сьвяткаваньні Дня Волі

* нядаўна заснавалі асобную сеціўную старонку (гл. інфармацыю на ст. 2)

Хаця, пасьля расколу 6 год таму, была створаная новая суполка ПАГОНЯ, філязофіяй грамады застаюцца гэткія прынцыпы: **не перацягваць сяброў зь іншых груповак, і супрацоўнічаць з усімі на беларускай культурнай глебе.**

Больш дэтальна можаце даведацца пра нашу дзейнасьць з артыкулаў у квартальніку КРЫВІЯ.

Яшчэ адна малая папраўка:

Апошніх пару год амаль уся ініцыятыва ў дзейнасьці грамады выходзіла ад малодшых сяброў: прадпрымальнікаў і студэнтаў.

Гэта яны запрашалі ў Прагу
- гурты СТАРЫ ОЛЬСА, Неўра Дзюбель

на сьвяткаваньні Дня Волі:
- Др. Алега Трусава, старшыню Таварыства Беларускай Мовы
- рэжысэра Віктара Дашука
- сьпевака Алеся Памідорава
- сьпявачку Тацьцяну Беланогую
- сьпевака Алеся Наркевіча

Няма ў нас сёньня ні кіраўнікоў, ні паплечнікаў. Сп. Цімошчанка й студэнты - гэта цяпер “матор“ грамады,

Сп. Станкевіч - адзін з галоўных “падтрымальнікаў.”

**ПАДРУГОЕ:**

Нажаль, сп. Алесь ня меў часу, ні магчымасьці пазнаёміцца з запраўднымі пачуцьцямі бальшыні тутэйшых беларусаў. Быццам, у бальшыні яны не жадаюць вяртацца на Радзіму. **Гэта ня зусім праўда** - яны проста *не жадаюць вяртацца ў цяперашнюю Беларусь* - бо ня бачаць там асабістых і эканамічных пэрспэктываў. А сярод студэнтаў - ніхто ня хоча заставацца на чужыне.

Бо падобны мэнталітэт, мова, звычаі чэскага народу - гэта яшчэ ня ўсё. Няма тут шавінізму, ні фобіі, але затое існуе абыякавасьць бальшыні Чэхаў да Беларусаў, як народу. Праўда, сярод маладых адукаваных Чэхаў маем прыхільнікаў - але іх мала. Наагул, у бліжэйшай будучыні тэрмін накшталт *“Чэх беларускага паходжаньня”* не прадбачыцца.

Нават тыя сябры, што пажаніліся з Чэшкамі і сяброўкі, што выйшлі замуж за Чэхаў, выкарыстоўваюць свой новы статус, каб часьцей наведаць Беларусь.

А пару былых палітычных азылянтаў пастараліся як найхутчэй набыць чэскае грамадзянства, каб магчы свабодна наведаць сваякоў на Радзіме.

Нажаль, адна з найбольшых балячак беларускае грамады ў Чэхіі - гэта *недацэньваньне й занядбаньне беларускамоўнай адукацыі сваіх дзетак*. Пра гэта скажам больш наступным разам...

У выніку такога занядбаньня можа дайсьці да таго, што наступнае пакаленьне паступова асымілюецца.

# НАВІНЫ з Бацькаўшчыны

## Адукацыйная праграма ад БХД

Актывісты стваранай партыі Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя запрашаюць на серыю лекцыяў у межах адмыслова распрацаванай адукацыйнай праграмы. Лекцыю будуць праводзіць беларускія адмыслоўцы ў розных галінах грамадзка-палітычнага і культурнага жыцця.

Пра зьмест лекцый распавядае каардынатарка БХД Валерыя Чарнаморцава:

- Гэта гісторыя, культура і паліталогія Беларусі, таксама эканоміка, праваабарона, прыродная спадчына Беларусі, таксама лідэрскія навыкі, патрэбныя чалавеку, які пачынае дзейнічаць актыўна ў грамадзкім і палітычным жыцьці. Таксама будуць невялічкія курсы па гісторыі хрысьціянскай дэмакратыі. Сёньня ўжо будзе поўны сьпіс лекцыяў, яны пройдуць цягам 2 тыдняў. Асноўныя лекцыі мы плануем выдаць у якасьці дыска.

Праграма пачалася ў суботу 12 сьнежня 2009. Першыя лекцыі прачыталі: вядомы краязнавец і музыка Аляксей Фралоў і гісторык, культуролаг і паэт Алесь Спіцын.

**Крыніца**: Яна Запольская, Радыё Рацыя, сьнежань 2009.

## Міністэрства замежных спраў і справа візаў

Міністэрства замежных спраў Беларусі адказала на ліст МГА “ЗБС “Бацькаўшчына”, у якім быў дасланы Зварот, прыняты на 4-й канферэнцыі беларусаў Балтыйскага рэгіёна і Беларусі. Зварот у МЗС быў перададзены па просьбе Таварыства Беларускай культуры ў Літве. У дакуменце дэлегатамі канферэнцыі выказвалася просьба перагледзець кошты на візы для сваіх суайчыньнікаў і па магчымасьці зрабіць візы бясплатнымі. Такая ж просьба была агучана і на Пятым зьезьдзе беларусаў сьвету МГА “ЗБС “Бацькаўшчына” (ліпень 2009).

У адказ на гэты зварот Міністэрства замежных спраў праінфармавала “Бацькаўшчыну” пра тое, што ў адпаведных выпадках прадугледжаны і выкарыстоўваюцца на практыцы “так званыя “ільготныя” правілы ў адносінах да замежных грамадзян, якія прадстаўляюць для беларускай дзяржавы інтарэс у розных галінах палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага і культурнага жыцьця”.

Далей ў лісьце даводзіцца, што працэдура атрыманьня беларускіх віз замежнымі грамадзянамі простая і зразумелая, да таго ж жыхары Латвіі, Літвы, Польшчы і Эстоніі могуць атрымліваць візы тэрмінам дзеяньня да 30 дзён без прадстаўленьня запрашэньня. А вось грамадзянам Беларусі для атрыманьня віз ў згаданыя краіны неабходна сабраць ад 10 да 14 дакументаў.

Што тычыцца кошту віз, то, на думку беларускага МЗС, “тарыфы на выдачу беларускіх віз жыхарам Латвіі, Літвы, Польшчы і Эстоніі зьяўляюцца мінімальнымі”, а далейшае спрашчэньне візавых працэдур магчымае “пры дасягненьні адпаведных дамоўленасцей паміж Беларусьсю і Еўрасаюзам”.

Старшыня Рады МГА “ЗБС “Бацькаўшчына” Ніна Шыдлоўская адзначыла: “З адказу Міністэрства замежных спраў вынікае, што беларусы замежжа, у тым ліку тыя, што працуюць на ніве беларушчыны ў краінах свайго пражываньня, дагэтуль нашай дзяржавай цалкам прыраўноўваюцца да іншаземцаў. І мы зноў упіраемся ў адсутнасьць закону аб беларусах замежжа. У лісьце размова ідзе пра агульную працэдуру атрыманьня віз замежнымі грамадзянамі, і абсалютна ня ўлічваецца, што і на Пятым зьезьдзе беларусаў сьвету, і ў Звароце дэлегатаў канферэнцыі беларусаў Балтыйскага рэгіёну вядзецца гаворка пра кошт віз менавіта для беларусаў, якія пражываюць за мяжой, – вялізарны патэнцыял для Беларусі. Натуральна, мы зацікаўлены ў спрашчэньні візавай працэдуры і танных шэнгенскіх візах для ўсіх грамадзян Беларусі, але гэтыя два пытаньні трэба разглядаць асобна. Менавіта беларуская дзяржава мусіць клапаціцца пра сваіх суайчыньнікаў у замежжы, і ў дадзеным выпадку палітыка Еўрасаюзу ня мае да гэтага ніякага дачыненьня”.

На думку кіраўніка МГА “ЗБС “Бацькаўшчына” Алены Макоўскай, “магчыма, гэтым лістом МЗС хацеў падкрэсліць, што беларусы замежжа павінны больш настойліва працаваць з урадамі сваіх краін у пытаньні спрашчэньня візавай працэдуры для грамадзян Беларусі. Але гэты мэсэдж быў бы прыняты беларускім замежжам пазітыўна, калі б беларуская дзяржава зрабіла пэўныя крокі ў вырашэньні візавага пытання для саміх беларусаў”.

У тым жа лісьце МЗС адказала і на просьбу “Бацькаўшчыны” аб прадстаўленьні бясплатных шматразовых візаў сябром Вялікай Рады МГА “ЗБС “Бацькаўшчына” – кіраўніком беларускіх суполак у замежжы. “МЗС арыентавала адпаведныя замежныя ўстановы Рэспублікі Беларусь адносна афармленьня кароткачасовых віз для наведваньня краіны сябрамі Вялікай Рады МГА “Згуртаваньне беларусаў свету “Бацькаўшчына”, – гаворыцца ў лісьце. Інфармацыі пра тое, ці будуць візы бясплатнымі, у лісьце няма. У тэлефоннай размове прадстаўнік МЗС паведаміў, што пытаньне кошту і тое, якімі будуць візы – шматразовымі ці аднаразовымі, будуць вырашаць самі замежныя ўстановы Рэспублікі Беларусь у краінах пражываньня сяброў Рады. Наколькі гэтае рашэньне дасць палёгку кіраўніком беларускіх суполак замежжа, застаецца пытаньнем.

**Крыніца**: Інфармацыйны цэнтр МГА “ЗБС “Бацькаўшчына”, 23.11.2009 г.

# Дзесяць год, як беларускамоўныя

У 2000 годзе школы, міліцыя і войска мусілі цалкам перайсьці на беларускую мову. «Закон аб мовах у Беларускай ССР», прыняты Вярхоўным Саветам БССР 26 студзеня 1990 года, адводзіў на беларусізацыю дзяржаўных установ 10 гадоў.

«Мова — ня толькі сродак зносін, а і душа народу, аснова і найважнейшая частка яго культуры. Жыве мова — жыве народ. Кожная мова, яе літаратурная, жывая мясцовая і гістарычная разнавіднасьць — неацэнны скарб, які належыць не аднаму народу, а ўсяму чалавецтву. Гонар і абавязак усіх — шанаваць родную мову, судзейнічаць яе развіцьцю і росквіту, паважліва ставіцца да моў іншых народаў». Гэтымі словамі пачынаецца «Закон аб мовах у Беларускай ССР».

Закон, які прадугледжваў наданьне беларускай мове статуса адзінай дзяржаўнай, быў прыняты 26 студзеня 1990 года Вярхоўным Саветам БССР XI скліка괄ньня — пераканаўчай большасьцю галасоў.

Вось як у сваіх успамінах узгадвае поўныя радаснага хваляваньня першыя хвіліны пасьля галасаваньня Ніл Гілевіч, ён быў кіраўніком працоўнай групы па падрыхтоўцы праекта Закона: «Калі на табло загарэліся выніковыя лічбы — воплескі ў залі прагучалі грымотныя

Старшыня Вярхоўнага Савету тут жа абвясьціў на 15 хвілінаў перапынак,— думаю, наўмысна, каб даць людзям абмяняцца пачуцьцём радасці. І дэпутаты гэтай радасьці не хавалі, і горача віншавалі адзін аднаго з перамогай. Збылося! Сталася! Здзейсьнілася! Беларуская мова ў Беларусі ад гэтага часу — дзяржаўная! Многія ад радасьці рашылі і скончыць на гэтым свой сёньняшні рабочы дзень. Нязвычайны, сапраўды гістарычны дзень! Тое, з-за чаго столькі перажывалі, хваляваліся, трымцелі душою,— адбылося. Закон прыняты! Усё! Назад ужо цяпер не адкруціш! (Запомнім, чытач, гэтыя словы, гэтыя наіўныя словы)».

Пазьней на аснове Закону аб мовах была складзена Дзяржаўная Праграма развіцьця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у Беларусі. Камісію па стварэньні праграмы ўзначальвала Ніна Мазай. 28 верасня 1990 г. праект праграмы зацьвердзіў Савет міністраў і яна пачала ажыцьцяўляцца на ўсіх узроўнях. Закон прадугледжваў паступовы пераход да ўжываньня беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадзкага і палітычнага жыцьця. Да канца 2000 году па-беларуску мусілі запрацаваць установы адукацыі, праваахоўныя органы, войска і г.д. Аднак ганебны рэферэндум 1995 года перакрэсьліў гэтыя планы, вярнуўшы расійскай мове статус дзяржаўнай. Выжываньне і разьвіцьцё беларускай мовы стала клопатам незалежнага грамадзтва.

* * *

Рада ТБМ зьвярнулася да кіраўніцтва краіны з патрабаваньнем адмяніць унесеныя ў «Закон аб мовах» у 1998 г. папраўкі, якія далі пачатак татальнай русіфікацыі. Таварыства прапануе выдаць указ прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб пашырэньні сферы ўжываньня дзяржаўнай беларускай мовы», у якім варта прадугледзець наступныя мерапрыемствы:

1. Павялічыць колькасьць гадзін беларускай мовы і літаратуры ў школах.

2. Аднавіць у ВНУ курс «Беларусазнаўства» на беларускай мове.

3. Вярнуць ва ўсе школы краіны выкладаньне курсаў гісторыі і геаграфіі Беларусі па-беларуску.

4. Адкрыць да 1 верасьня 2010 г. у кожным абласным і раённым цэнтры Беларусі па адной беларускамоўнай школе ці гімназіі.

5. Зрабіць даплаты ў памеры 20% заробку выкладчыкам ВНУ, якія выкладаюць свае прадметы па-беларуску.

6. Зрабіць абавязковым школьны экзамен па беларускай літаратуры.

**Крыніца**: Сямён Печанко, Таварыства Беларускай Мовы, 26 студзеня 2010

## Малады фронт" пераабраў кіраўніцтва

На Зьезьдзе “Маладога фронту” 30 студзеня былі абраныя старшыня й намесьнікі старшыні арганізацыі, афіцыйна зарэгістраванай у Чэскай Рэспубліцы. Пра гэта паведаміла прэсавая служба “МФ”.

Старшынём арганізацыі быў пераабраны Зьміцер Дашкевіч: за яго кандыдатуру прагаласавала 80, 2% заснавальнікаў “МФ”.

На пасады намесьнікаў старшыні "Маладога Фронту" былі прапанаваны кандыдатуры 5 чалавек. Галасаваньне адбывалася паводле мажарытарнай сыстэмы абсалютнай большасьці (больш за 50%).

Усе прэтэндэнты, а менавіта: Мікола Дземідзенка (рэгіянальны накірунак), Алесь Кіркевіч (патрыятычна-спартовы накірунак), Наста Палажанка (рэгіянальны накірунак), Тацьцяна Шапуцька (інфармацыйна-міжнародны накірунак) і Іван Шыла (адукацыйна-міжнародны накірунак) прайшлі.

Зьезд зацьвердзіў папярэдні плян дзеяньняў намесьнікаў старшыні "Маладога фронту" і шэраг новых кампаніяў: па далучэньні Беларусі да Балёнскага працэсу, ратыфікацыі Беларусьсю Эўрапейскай алькагольнай хартыі і інш.

Акрамя таго, была зацьверджана стратэгія "Маладога фронту" пад назовам "Новае пакаленьне".

**Крыніца:** Радыё Свабода, 31.01.2010

## Ці дапаможа суд, каб вучыцца па-беларуску?

**Сям’я Лапіцкіх з Жодзіна працягваюць змаганьне за права навучаньня ў школе іх сына Янкі на беларускай мове. Спачатку Ян вучыўся ў беларускамоўным класе, а пасля таго як у Жодзіне такія класы зьніклі, нейкі час з Янькам Лапіцкім займаліся па індывідуальнай праграме.**

Але і такой магчымасьці Лапіцкія неўзабаве пазбавіліся. Тады бацькі Янкі зьвярнуліся ў суд. Разгляд справы прызначаны на 10 лютага. **Аляксей Лапіцкі** кажа, што ўлады ўжо прыдумалі тактыку абароны:



*Янка Лапіцкі*

*Выканкам выказаў сваю пазіцыю, што мы прапусьцілі тэрмін абскарджваньня рашэньня гарвыканкама. Суд хутчэй за ўсё будзе разглядаць тую пазіцыю, якую мае выканкам. Ім пажадана, канешне, не разглядаць гэта, таму што ў часе разгляду можна ініцыяваць не адну адміністрацыйную справу па неправамерных дзеяньнях чыноўнікаў, якія не давалі адказы, або парушалі закон аб зваротах грамадзянаў.*

У прыватных размовах **Аляксей Лапіцкі** не аднойчы чуў ад настаўнікаў, што ягоныя праблемы ўзьніклі з-за таго, што ён займаецца палітыкай і праваабарончай дзейнасьцю. Таму індывідуальнае навучаньне Янкі па-беларуску было прыпынена.

Крыніца: Радыё Рацыя, 7. 2. 2010

## Спэцназаўцы разагналі акцыю ў Дзень сьвятога Валянціна

Каля трыццаці сяброў моладзевага дэмакратычнага руху трапілі ў міліцыю ў выніку жорсткага разгону акцыі ў дзень сьвятога Валянціна. Спэцназаўцы закідвалі людзей у аўтобусы за рукі і за ногі. Празь дзьве гадзіны пасьля затрыманьня людзей пачалі адпускаць без складаньня пратаколаў.




Маладафронтаўцы рыхтаваліся да турмы, што на вуліцы Акрэсьціна. Яны былі зьдзіўленыя, калі міліцыянты атрымалі загад усіх адпусьціць. Намесьнік старшыні “Маладога фронту” **Іван Шыла** трапіў у міліцыю разам са сваім непаўналетнім братам Ільлём. Міліцыянты пагадзіліся адпусьціць Ільлю пад подпіс старэйшага брата.

Гаворыць Іван Шыла:

“Я думаю, што ўладам пэрыядычна трэба паказваць, што яны не расслабляюцца. Ды й дыялёг трэба ж весьці такімі мэтадамі: паказваць пэрыядычна карцінку брутальнага разгону, каб мець магчымасьць гандляваць па нейкіх дробных пазыцыях”.

А 18 гадзіне на плошчы Свабоды сабраліся каля чатырох дзясяткаў чалавек, большасьць зь якіх складалі сябры “Маладога фронту”. Яшчэ больш на плошчы прысутнічала міліцыянтаў ад вышэйшага кіраўніцтва да шараговага спэцназаўца.

Як толькі маладыя людзі дасталі сьцягі і расьцяжкі, на іх накінуліся спэцназаўцы. Некалькі чалавек яны зьбілі з ног і цягнулі ў аўтобус на ногі і за рукі.

“Я пісала гэтую расьцяжку: “Люблю Беларусь!”. Нельга любіць?! Я не разумею” – сказала **Марына Манчалоўская**, якая прыйшла на плошчу са сваімі бацькамі.

Намесьнік старшыні “Маладога фронту” **Мікола Дземідзенка** распавёў, як з затрыманымі абыходзіліся ў аўтобусе.

“Нас зьбівалі яшчэ й у аўтобусах, не давалі сесьці на сядзеньне. Сядзелі ўсе на падлозе. Калі нас прывезьлі ў Цэнтральны РУУС, то там паставілі ля сьцяны ў калідоры. Не давалі размаўляць, самі ўвесь час матам лаяліся”.

Калі хлопцаў закінулі ў аўтобус, дзяўчаты, апранутыя ў чырвона-белыя касьцюмы з анёльскімі крыламі пайшлі на праспэкт Незалежнасьці. Іх адразу абкружылі спэцназаўцы і пачалі цягнуць у аўтобус. **Юлію Міхайлаву** ды іншых дзяўчат цягнулі за ногі.

Гаворыць **Тацяна Шапуцька**:

"Яны пачалі адбіраць маладафронтаўскі сьцяг, а я не аддавала. І тут мне амапавец паставіў падножку, я павалілася на асфальт і ўдарылася галавой.

У аўтобусе яны нас кідалі адзін на аднаго і не давалі нам сесьці на "сядушкі". Кідалі ўсіх на праход пластамі. Уявіце, як 70-гадовую Ніну Багінскую кідаюць на іншых жанчын, дзяўчат...

Адзін хлапец сядзеў на сядзеньні. Да яго падыйшоў амапавец, зваліў яго і сказаў: "Ты квіток не набываў".

**Міхаіл Пашкевіч** прыйшоў на плошчу Свабоды, каб атрымаць прэмію "Люблю Беларусь". Яго моцна зьбілі ў міліцыі, калі ён заступіўся за **Насту Палажанку**. Хлопцу разьбілі акуляры і адабралі прыз-статуэтку.

"Трохі "папіналі", а потым вывелі ў асобны пакой. Сказалі, што будзеш тут сядзець як буйны. Пасадзілі разам з побытавымі хуліганамі. Акуляры пабілі, прэмію забралі. Не аддалі. Сказалі: "Нічога ня ведаем".

Затрыманыя ўдзельнікі акцыі ня бачаць сэнсу зьвяртацца са скаргамі на дзеяньні міліцыянтаў, бо на ўсе ранейшыя заявы атрымлівалі адказ, што міліцыянты дзейнічалі ў рамках дзейнага заканадаўства.

У Менску актывісты моладзі БНФ і БХД раздавалі менчукам паштоўкі, у якіх быў надрукаваны верш Дуніна-Марцінкевіча. Іх затрымалі на плошчы Якуба Коласа і больш за тры гадзіны раіліся з кіраўніцтвам што рабіць далей. У выніку паштоўкі міліцыянты забралі сабе, а актывістаў адпусьцілі без складаньня пратаколаў.

**Крыніца:** Любоў Лунёва, Радыё Свабода, 15.02.2010

## БПЦ падтрымае хадайніцтва па рэабілітацыі Ларысы Геніюш

**Аргкамітэт па ўшанаваньні памяці Ларысы Геніюш падрыхтаваў зварот да кіраўніцтва краіны з хадайніцтвам аб рэабілітацыі паэткі. Пад ім падпісаліся вядомыя прадстаўнікі культуры і грамадзкага жыцьця Беларусі.**

Далучаецца да гэтага хадайніцтва і Беларуская праваслаўная царква. Пра гэта паведаміў Радыё Рацыі старшыня аргкамітэту **Міхась Скобла**:

- Зварот падрыхтаваны. Нядаўна я сустракаўся з архімандрытам Аляксеем Шынкевічам, прадстаўніком беларускага экзархату па сувязі з грамадзкасьцю. Царква таксама падтрымае гэты зварот і далучацца да гэтага хадайніцтва.

Зварот адносна рэабілітацыі **Ларысы Геніюш** будзе пададзены ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь і ў кіруючыя органы краіны. Нагадаем, што сёлета 9 жніўня спаўняецца стагодзьдзе вялікай беларускай паэткі. З тае нагоды на леташнім зьезде беларусаў свету 2010 год быў абвешчаны Годам Ларысы Геніюш.

**Крыніца:** *Радыё Рацыя,* **18 лютага 2010**

## Саньнікаў ідзе на прэзыдэнцкія выбары

Каардынатар кампаніі "Эўрапейская Беларусь", былы намесьнік міністра замежных спраў Андрэй Саньнікаў прыняў рашэньне балятавацца на будучых прэзыдэнцкіх выбарах у Беларусі.



Ён абяцае неўзабаве зрабіць больш разгорнутую заяву. Раней пра намер удзельнічаць у прэзыдэнцкіх выбарах ён паведаміў падчас запісу праграмы на "Белсаце".

У размове з карэспандэнтам "Свабоды" спадар Саньнікаў заявіў, што "разьлічвае на падтрымку апазыцыі і шмат каго ў Беларусі".

"Цяпер якраз насьпеў момант радыкальна зьмяніць сытуацыю ў Беларусі. 16 гадоў пануе дыктатура, народ стомлены. Беларусі патрэбная свабода і эўрапейскі кірунак разьвіцьця. Беларусі патрэбная сапраўдная абарона правоў чалавека, а не балбатня, пра якую мы чуем. І ў Беларусі цяпер ёсьць шанец зноў вярнуцца на дэмакратычны шлях разьвіцьця", — заявіў А.Саньнікаў.

**Крыніца:** Радыё Свабода, 9 сакавіка 2010

## Шапуцька: "І ў кіно ходзім, і зь дзяўчатамі пляткарым, і асабістае жыцьцё маем!.."

**Тацьцяна – гераіня апошніх "вестак з франтоў". Спачатку яна, прэсавая сакратарка "Маладога Фронту", узяла ўдзел у Форуме грамадзянскай супольнасьці Усходняга Партнёрства. Па вяртаньні з Бруселя была адлічаная з другога курса юрфака БДУ. На апошнім зьездзе МФ была абраная намесьнікам старшыні. Днямі паступіла на другі курс Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсітэту ў Вільні (завочнае аддзяленьне). *"МЫ"* сустрэліся з Тацьцянай Шапуцькай, каб зразумець, што яна за чалавек і высьветліць, чаму яна, як усе, не "зваліла" вучыцца за мяжу.**

**- Тацьцяна, вашае адлічэньне – ня першая такая дзея з боку ўладаў у дачыненьні да моладзевых актывістаў, і самі ўлады кожны раз пазіцыянуюць гэта аднолькава – "прагульвалі, ня вучыліся, абы што тварылі, парушалі правілы". Давайце паспрабуем аспрэчыць гэтае меркаваньне. Раскажыце пра свае посьпехі ў вучобе.**

*- Якраз-такі на маім прыкладзе аспрэчыць гэтае меркаваньне даволі лёгка, таму што мае адукацыйныя посьпехі даволі высокія – сярэдні бал 8,5. У мяне ня было ні разу ніякай пераздачы, ня было ніякіх канфліктаў з выкладчыкамі і гэтак далей. Праблемаў з пропускамі я, у адрозьненьне ад сваіх шматлікіх сакурсьнікаў таксам ня мела. Таму ў маім адлічэньні – відавочны палітычны падтэкст. А што тычыцца звычайных меркаваньняў,*

*што актывістам апазіцыі ня трэба прагульваць, ня трэба кудысьці выяжджаць – гэта папулісцкія выразы. Бо ў кожнага чалавека можа ўзьнікнуць такая патрэба – некуды паехаць, штосьці прапусьціць. І канешне, маладыя людзі, якія займаюцца апазіцыйнай дзейнасьцю, яны мусяць усьведамляць, што за імі пільны нагляд і нельга дапускаць грубых праколаў. Але адлічэньне ці прэсінг у дачыненьні да актывістаў апазіцыі – гэта звычайная дыскрымінацыя па палітычных поглядах.*

**- Тацьцяна, мы ўжо сутыкнуліся з меркаваньнем афіцыйным – з боку Леаніда Козіка, і з меркаваньнем неафіцыйным – на форумах у інтэрнэце, што нічога б дрэннага ня здарылася, калі б Шапуцька не паехала на гэты Форум, што Форум неяк адбыўся б і бяз вас. Навошта было так падстаўляцца, пры тым, што за паездкі за мяжу без дазволу міністэрства ўжо былі выключэньні актывістаў апазіцыі?**

*- Такая мера не магла быць прынятая, не павінны былі мяне выключыць, бо згодна са Статутам універсітэту, мусіць улічвацца цяжар правіны, пяпярэдняя вучоба ды іншае. Гэтая мера ўзьдзеяння, якая была ўжытая ў дачыненні да мяне – яна была незаконна перабольшаная. Таксама можна сказаць, што Форум адбыўся б бязь любога ўдзельніка, у тым ліку і без спадара* ***Козіка****. Аднак гэта форум грамадзянскай супольнасьці, і калі нашай арганізацыі быў прадстаўлены гонар прадстаўляць там моладзевыя арганізацыі краіны (МФ быў адзінай моладзевай арганізацыяй, запрошанай на гэты Форум), то мы не маглі гэтым правам не скарыстацца.*

**- Тацяна, давайце сыйдзем ад гэтых няпрыемных тэмаў – і вернемся ў час вашага дзяцінства, юнацтва. Вось гэтыя посьпехі ва ўніверсітэцкай вучобе – яны ж узяліся не на пустым месцы?**

*- У плане вучобы мае вынікі нават трошку зьнізіліся, бо ў мінскай гімназіі №1 імя Францішка Скарыны я мела сярэдні бал 9,1 па выніках атэстату. Я была звычайным падлеткам, толькі з тым ухілам, што з 16 год я ў "Маладым Фронце". Я пільна займалася вучобаю, вывучэньнем замежных моваў, скончыла музычную школу па класе фартэпіяна, год займалася айкідо, 6 год займалася танцамі – то бок, у мяне было даволі разнастайнае дзяцінства і падлеткавы пэрыяд.*

**- Атрымліваецца, што вы захапіліся палітыкай яшчэ ў часе навучання ў гімназіі?**

*- Гэта адбылося напрыканцы 2005 году, аднак тады я яшчэ ня была ў нейкай арганізацыі, была вольным птахам. А пасьля ўжо ўвайшла ў арганізацыю "Малады Фронт", недзе праз паўгады.*

**- У гімназіі былі праблемы праз палітыку?**

*- Так, яшчэ ў 10 класе ў мяне было два затрыманьні і дзьве адміністрацыйныя камісіі. У школу прыходзілі супрацоўнікі МУСа, якія ўсталявалі за мной нагляд з мэтаю выхаваньня, прыходзілі і супрацоўнікі КДБ...*

**- Значыцца, вы лічыліся праблемным дзіцёнкам у разуменьні школы?**

*- Я ня лічылася праблемныям дзіцёнкам! У мяне ня было ніякіх іншых праблемаў – апроч таго, што я была ў апазіцыі. Аднак на камісіі па справах няпоўнагадовых я была ў выканкаме. Школьную камісію я прапусьціла, бо палічыла яе непатрэбнай.*

**- Тацьцяна, а як вашая сям'я ставіцца да вашай дзейнасьці і да праблемаў, якія яна выклікае?**



*- Насамрэч у апазіцыю я прыйшла менавіта дзякуючы бацьком, таму што ў 15 год наўрад ці я магла яшчэ нешта цьвяроза асэнсоўваць і нешта правільнае абраць у такім важным накірунку, як палітычная арыентацыя. І менавіта з іх актыўнасьці пачаўся мой грамадска-палітычны шлях. У 2005-06 годзе яны наведвалі ўсе сустрэчы зь* ***Мілінкевічам****, з* ***Казуліным****, зь іншымі кандыдатамі. І я хадзіла разам зь імі, бо мне гэта было цікава, старалася ўсюды ўсунуць свой нос. Пасьля троху пасталела – і пачала займацца гэтым больш актыўна. Бацькі, вядома, здагадваліся, чым гэта можа скончыцца для мяне. І калі я толькі паступіла ў БДУ тата запытаў, навошта я гэта зрабіла, калі мяне ўсё роўна адтуль адлічаць. Зараз ён пабачыў, што яго перасьцярога спраўдзілася.*

**- А вы ў БДУ на платным вучыліся ці на бясплатным?**

*- На бясплатным – і нават атрымлівала падвышаную стыпэндыю!*

**- Тацьцяна, а хто вашыя бацькі?**

*- Паводле адукацыі мае бацькі фізікі, але ўжо не займаюцца ніякай навуковай працай гадоў дваццаць. Тата – індывідуальны прадпрымальнік, мама 18 год не працавала, гадавала нас з братам, але ў гэтым годзе выйшла на працу – дапамагае тату.*

**- Тацьцяна, вы ўжо тры гады ў "Маладым Фронце". Як вы ацэньваеце дзейнасьць гэтай арганізацыі?**

*- МФ пачаў сталець. Раней выйсьці на якую вулічную акцыю – гэта ўжо было крута. Цяпер такая фішка не пракаціць нават у апазіцыйным асяродку. "Малады Фронт" лічыўся выключна "вулічнай" арганізацыяй, але цяпер гэты імідж зьмяняецца, мы пачынаем праводзіць адукацыйныя мерапрыемствы для сваіх актывістаў, удзельнічаем у палітычных кампаніях, разьвіваемся менавіта як палітычны суб'ект.*

**- Тацьцяна, агульнавядома, што большасць адлічаных апазіцыйных актывістаў зьехалі вучыцца за мяжу – і пра іх зараз увогуле ня чуваць. Людзі, як кажуць, "у шакаладзе". Чаму вы не "звалілі"?**

*- Гэта было прынцыповае пытаньне. Яшчэ да паступленьня ў БДУ я мела магчымасьць паехаць вучыцца ў Італію. Калі б хацела – ужо некалькі год вучылася б у Італіі. Але я разумею, што людзі, якія стаяць за маім адлічэньнем, - яны хочуць, каб як мага больш маладых людзей з актыўнай жыцьцёвай пазіцыяй зьехала за мяжу. Ім так прасьцей адсочваць сітуацыю. У мяне такога пытаньня – зьехаць за мяжу – і не стаяла. А большасьць тых, хто зьехаў, правучыўшыся там 5 год, як сапраўдныя беларусы,*

*адаптуюцца – і прабыўшы столькі ва ўтульнай эўрапейскай краіне з эўрапейскай вольналюбівасьцю – не вяртаюцца ў постсавецкую Беларусь. Я не хацела паддавацца гэтай спакусе. Ды і ўсе мае сябры тут.*

**- Тацьцяна, пра апазіцыйных актывістаў мы чуем звычайна “навіны з фронту”: затрымалі, зьбілі, акцыю правялі… З чаго складаецца вашае жыцьцё - апроч “змагання з крывавым рэжымам”?**

*- З чаго складаецца… З усіх чыньнікаў, зь якіх можа складацца жыцьцё маладой дзяўчыны. Не магу сказаць, што ў чымсьці сябе прыгнятаю…*

**- Ну, скажам, ці ходзяць актывісткі ў кіно, ці пляткараць зь дзяўчатамі, ці маюць асабістае жыцьцё?**

*- Апазіцыянеры – звычайныя людзі, у іх звычайнае жыцьцё! Толькі жыцьцёвая пазіцыя, напэўна, асаблівая. Яны прысьвячаюць больш часу актыўнай дзейнасьці. Але ёсьць і паходы ў кіно, і пасядзелкі ў кавярні, і плёткі зь дзяўчатамі, і асабістае жыцьцё. Гэта ня нейкія маргіналы, якія сядзяць дзень і ноч, набіраюць улёткі, лепяць іх суткамі, пішуць палітычныя звароты з патрабаваньнем сыйсці рэжыму. Звычайныя людзі. І жывуць, як павінны жыць людзі.*

**- Як вы лічыце, калі ў Беларусі зьменіцца ўлада?**

*- Гледзячы пра што мы кажам. Калі казаць пра афіцыйную ўладу як дзяржаўнае кіраваньне – то яна можа зьмяніцца і заўтра, і пазаўтра. Бо людзі маюць уласьцівасць паміраць, ніколі невядома, што калі можа з кім здарыцца. Але калі казаць па сутнасці, то мяркую, што на рэфармацыю Беларусі спатрэбіцца 10-15 гадоў, бо ў нас, нажаль усё так запушчана, што рэфармацыі патрабуе ня толькі палітычная сістэма – але і эканоміка, адукацыя, навука, культура… Гэтая постсавецкая ментальнасьць, - яна будзе адсюль доўга выкараняцца.*

**Крыніца: Кандрат ВІТКО**, старонка *“МЫ”*
10 лютага 2010

## У Беларусі прайшло сьвяткаванне Дня Волі

**Каля будынку Нацыянальнай акадэміі навук адбыўся ўрачысты мітынг, падчас якога апазіцыйныя палітыкі заклікалі беларусаў да салідарнасьці, і выказалі надзею на тое, што гэтае сьвята стане дзяржаўным. Мітынг праходзіў у месцы, дазволеным уладамі. Пазьней каля ста яго ўдзельнікаў, на чале з моладзевым лідарам Артурам Фінкевічам, вырашыла накіравацца па праспекце Незалежнасьці ў бок плошчы Якуба Коласа.**

Калону спецназаўцаў і мірных дэманстрантаў аддзяляла каля 20 метраў. Пасьля невялікай тузаніны і перамоваў з міліцыянтамі, удзельнікі акцыі вырашылі згарнуць расьцяжкі і сьцягі.

Апошнім слова трымаў **Артур Фінкевіч**:

*Разам з вамі мы адсьвяткавалі гэты дзень Волі. Няхай у гэтым годзе мы яго не адсьвяткавалі ў цэнтры. Але я ўпэўнены, што прыдзе час, калі гэты дзень стане нацыянальным і дзяржаўным сьвятам Беларусі - Днём незалежнасьці. Я ўпэўнены, что на прэзыдэнскіх выбарах наступнага году пераможа кандыдат ад Беларускага незалежніцкага Блоку. Дарагія сябры! Мне падаецца, што мы з вамі робім вартую справу. Дзякуй вам вялізны! Жыве Беларусь! Жыве!!!*

Падчас акцыі, прысвечанай Дню Волі, ніхто зь яе удзельнікаў затрыманы ня быў. У акцыі прыняло ўдзел каля дзьвюх тысячаў чалавек.

**Крыніца:** Радыё Рацыя, 26 сакавіка 2010

# Беларусы Эўразьвязу

## Ахвяравалі, каб жыла Беларусь

*…"Я буду маліцца і сэрцам, і думамі,*
*Расьпетаю буду маліцца душой,*
*Каб чорныя долі зь мяцеліцаў шумамі*
*Ня вылі над роднай зямлёй, нада мной.*
*/"Мая малітва" Янка Купала/*

У апошнюю суботу лютага па традыцыі адбылося чарговае мерапрыемства ў Таварыстве Беларускай Культуры ў Літве. Першым выступіў старшыня ТБК Хведар Нюнька, ён распавёў пра прэзентацыю фільму аб дзейнасьці нашай арганізацыі рэжысэра Вольгі Мікалайчык "Беларускія справы", якая адбылася ў Менску 20 лютага ў страўні "Камяніца", на якой адбылася і сустрэча з старшынём ТБК. На сустрэчу прыйшла інтэлігенцыя, сярод іх - акадэмік Радзім Гарэцкі, старшыня ТБМ Алег Трусаў, кіраўніцтва "Бацькаўшчыны", пісьменьнікі. Спадар Хведар атрымаў у падарунак шмат кніг беларускіх аўтараў з дэдыкацыяй і першы нумар новага часопісу "Верасень", які многіх зацікавіў.

Люты ў гэтым годзе выдаўся багатым на юбілейныя даты. Гэтым разам гаварылі і пра **Гудзевіцкі музэй** і яго стваральніка Алеся Белакоза, пра каштоўнасьць экспанатаў і іх значэньне для беларусаў. У музэі знаходзіцца адзіны глобус на беларускай мове зь віленскай беларускай гімназіі, падараваны Янкам Багдановічам, які меў жаданьне і больш рэдкіх экспанатаў передаць для музэя, але А.Белакоз ня змог прыехаць у Вільню ў той час. І хто ведае , можа і часопісы "Шлях моладзі" былі б у музэі з сямейнага архіву сям’і Я.Багдановіча. Чальцы ТБК наведалі Гудзевічы некалькі разоў, ехалі ня толькі на сустрэчу з спадаром Алесям, але і паблукаць па мясьцінах, зьвязаных з жыцьцём паэткі Ларысы Генію ш.

У лютым споўнілася 120 год з дня нараджэньня беларускага сьвятара **Казіміра Сваяка**. Ён нарадзіўся на беларуска-літоўскім памежжы ў вёсцы Барані, цяпер Астравецкі раён. З 1915 да 1920 году служыў сьвятаром у Клюшчанах, потым у парафіі Засьвір, пазьней - у Камаях. У мінулым годзе кола чальцоў ТБК наведала гэтыя мясьціны, удзячныя нашчадкі помняць славутага сьвятара, паэта- каля касьцёла ў Клюшчанах пастаўлены помнік, у Камайскім і Засьвірскім касьцёлах - таблiцы, у Астраўцы адна з вуліц носіць імя Казіміра Сваяка. У Баранях захавалася хата, у якой жыў сьвятар, там плянуецца адкрыць музэй. Казімір Сваяк- псэўданім, сапраўднае прозьвішча Казімір Стэповіч. Пад псэўданімам ён выступаў у друку. Пачатак ХХ стагодзьдзя адзначаецца ў беларускай гісторыі і уздымам беларусізацыі каталіцкага касьцёла. Беларусь - хрысьціянская краіна і на беларускай мове можна казаць казаньні, пісаць вершы трактаты. Казімір Сваяк - сьвятар, паэт, грамадзкі дзеяч,

які рабіў беларусізацыю беларускага касьцёла, пісаў вершы пранікнутыя любоўю да роднага слова, да радзімы. Пры жыцьці выйшаў адзіны зборнік вершаў "Мая ліра", раней вершы К.Сваяка нават былі ўключаны ў праграму для чытаньня ў школах, з прыходам савецкай улады пачалося зьнішчэньне сьвятыняў, выключылі з праграм і творы сьвятароў. У маім архіве ёсьць малітоўнік "Голас душы", укладзены К.Сваяком, экспанат для будучага музэя. К.Сваяк самаахвярна служыў беларушчыне, на алтар беларушчыны аддаў і сваё жыцьцё. Пражыў ён толькі 36 год, памёр ад невылячальнай у той час хваробы - сухотаў. Ён хацеў, каб на яго магіле маліліся на трох мовах- беларускай, польскай і літоўскай, што і было зроблена ў гэтым годзе. Пахаваны Казімір Сваяк на могілках Росы ў Вільні, у 1989 годзе паказаў магілу Сваяка дзядзька Лявон Луцкевіч, цяпер туды не зарастае сьцежка, прыходзяць беларусы-віленчукі, прыяжджаюць з Беларусі, Польшчы.

Пра К.Сваяка распавёў дасьледчык жыцьця і дзейнасьці беларускіх сьвятароў **Алесь Адамковіч.** У сваім выступе дакладчык гаварыў і пра дзейнасьць і нялёгкі жыцьцёвы шлях ксяндза Ул.Талочкі, які першым пачаў гаварыць казаньні па- беларуску ў касьцёлах Вільні, за сваю дзейнасьць разам з ксяндзом Адамам Станкевічам быў высланы зь Вільні, пра Андрэя Цікоту- генерала ордэна Марыянаў, якога не кананізавалі толькі таму, што ён меў першародны грэх- нарадзіцца беларусам. У Вільні беларускія сьвятары ордэна айцоў Марыянаў мелі сваю маёмасьць - дамкі на Жыгімонцкай вуліцы, гэта маёмасьць перададзена літоўскім Марыянам, аб гэтым таксама гаварыў дакладчык. Пра паўстанца Кастуся Каліноўскага расказаў студэнт ЕГУ **Кірыл Атаманчык.**



*Кірыл Атаманчык*

Галоўнай часткай мерапрыемства была прэзентацыя фільму **Вольгі Мікалайчык "Яна Палякова"**. Так атрымалася, што апошім часам першы паказ адбываецца у ТБК, зь якім па словах рэжысёра яна параднілася, тут ёй добра працуецца, узьнікаюць новыя ідэі. Фільм нікога з прысутных не пакінуў раўнадушным. Як магло так здарыцца, каб прыгожая, таленавітая, разумная жанчына ў 33 гады, даведзеная да адчаю паканчыла жыцьцё самагубствам. Можна толькі здагадвацца, што адчуваў чалавек, які выбраў такі шлях. 7 сакавіка спаўняецца год, як Яна Палякова зышла з жыцьця. Страшная навіна ў 2009 годзе ўскалыхнула беларускае грамадзтва. Прайшоў год. Ці панесьлі пакараньне віноўнікі? Такія пытаньні гучалі ў залі пасьля прагляду дакументальнай стужкі. Цяжка было глядзець, цяжка было працаваць над фільмам, яшчэ цяжэй асэнсаваць - за што Беларусі - гэта місія. Прыйшлі на мерапрыемства людзі, для якіх беларушчына- сэнс жыцьця.

Жыве Беларусь!

**Леакадзія Мілаш**, г Вільня, 2 сакавіка 2010

## У Вільні ўшанавалі памяць Кастуся Каліноўскага

22 сакавіка 1864 году ў Вільні загінуў нацыянальны герой Беларусі Кастусь Каліноўскі. У сталіцы Літвы ўшанавалі памяць змагара ўрачыстай акадэміяй і шэсьцем у цэнтры гораду зь бел-чырвона-белымі сьцягамі.

Шэсьце пачалося ад крыжа змагаром за свабоду Літвы, які стаіць над мэмарыяльнай плітой паўстанцам 1863-1864 гадоў каля касьцёла Сьвятога Якуба на Лукішскім пляцы. Удзельнікі сабраліся, нягледзячы на дождж, а з раніцы памятнае месца прыбралі і ўпрыгожылі кветкамі і сьвечкамі актывісты «Віленскага беларускага музэя імя І. Луцкевіча». Далей грамада са сьцягамі прайшла ад таго месца, дзе стаяла шыбеніца (каля будынку суда пры Лукішскай плошчы, там цяпер знаходзіцца сымбалічны помнік ахвярам сталінскіх рэпрэсіяў) на праспэкце Гедыміна да Замкавай гары, дзе Каліноўскі быў пахаваны. У шэсьці ўзялі удзел каля 60–70 чалавек, віленчукі, актывісты зь Беларусі, студэнты ЭГУ і каля 20-ці беларускіх студэнтаў-каліноўцаў, якія адмыслова дзеля гэтага прыехалі з Польшчы.



**Любоў Кучынская**, студэнтка Гуманітарнай Акадэміі імя Аляксандра Гэйштара з горада Пултузка з-пад Варшавы, прадстаўляла «Эўрапейскую Беларусь»:

«У Вільні я ўпершыню, ехалі ўначы, сёньня ж уначы вяртаемся, бо заўтра працоўны дзень. Не шкадую, што прыехалі, таму што такія рэчы трэба памятаць, таму што ў нас нічога іншага такога ўзроўню няма. Трэба берагчы тое, што ў нас ёсьць, і прыехаць менавіта на гэтае месца. Гэта наш абавязак».

Перад шэсьцем у Эўрапейскім гуманітарным унівэрсітэце ў Вільні прайшла ўрачыстая акадэмія. З адкрытымі лекцыямі выступілі гісторыкі і краязнаўцы. Беларускі гісторык **Уладзімер Хільмановіч** з Гародні:

«Нягледзячы, што гэта адносна нядаўняя гісторыя, гісторыя другой паловы 19-га стагодзьдзя, паўстаньне вельмі слаба асьветленае, слаба вывучанае. Часьцяком я кажу, што нават пра нашае сярэднявечча мы ведаем болей, бо больш напісана грунтоўных працаў. Па-сутнасьці, няма

яшчэ грунтоўных манаграфіяў пра гэтае паўстаньне ва ўсёй беларускай гістарыяграфіі. Трэба вывучаць, каб нашая мінуўшчына не абрастала новымі мітамі, каб сутнасьць гэтага паўстаньня была зразумелая кожнаму патрыёту Беларусі».

Дзень памяці Кастуся Каліноўскага ў Вільні арганізавалі актывісты «Беларускай нацыянальнай памяці» з Варшавы разам са студэнтамі ЭГУ, актывістамі моладзевай ініцыятвы "СтудАльянс", да якіх далучыліся віленскія беларускія арганізацыі.

Старшыня «Беларускай нацыянальнай памяці» **Анатоль Міхнавец**:

«Шмат гістарычных падзеяў, але ёсьць два дні — дзень нараджэньня Кастуся Каліноўскага і дзень сьмерці, якія мы павінны ўзгадваць. Таму мы ўзгадалі дзень яго нараджэньня маршам на лыжах у Мастаўляны, дзе ён нарадзіўся, а на дзень сьмерці мы прыехалі ў Вільню, дзе ён загінуў і спадзяемся, што гэта стане традыцыйным кожны год. Калі б тут нешта ладзілі мясцовыя беларусы, мы б ня прыехалі, можа. А так, мы называем сябе «Беларускай нацыянальнай памяцьцю» і ня прыехаць, нічога не зрабіць проста было б сорамна. Таму мы тут, і мы рады і ўдзячныя, што мясцовыя беларусы далучыліся і падтрымалі».

Ніякага памятнага знаку на Замкавай гары ў Вільні, дзе пахаваны Кастусь Каліноўскі, цяпер няма, хаця месца пахаваньня дакладна вядомае. На гэтым месцы удзельнікі шэсьця запалілі сьвечкі, усклалі кветкі.

«Беларуская нацыянальная памяць» заклікала ўсіх беларусаў у тых гарадах, дзе ёсьць вуліцы імя Кастуся Каліноўскага ці памятныя знакі ў гонар героя, ушанаваць яго ў дзень сьмерці, 22 сакавіка, -- запаліць сьвечкі, пакласьці, дзе магчыма, кветкі.

**Крыніца:** Таня Поклад, Радыё Свабода.

## Дапаможам Сяргею Вітушку выдаць кнігу

**Заклікаем далучыцца да справы выданьня кнігі Сяргея Вітушкі, чалавека, які добра вядомы ўсёй беларускай сябрыне. Дастаткова ўзгадаць легендарную Талаку, дзе ён быў адным з лідэраў. Усе свае сілы і здольнасці сп.Сяргей скіраваў на адраджэньне Беларусі!**

Больш падрабязна пра **Сяргея Вітушку** тут:

**http://kamunikat.org/8257.html**. У выніку хваробы сп. **Сяргей** згубіў зрок. Але ён ня здаўся. Зараз падрыхтаваў кнігу казак, якая будзе цікавая як дзецям, так і дарослым. Агульны кошт выдання складае каля 4 тысяч эўра. Давайце Талакою дапаможам выдаць кнігу.

Грошы можна ахвяраваць на асабісты рахунак **Сяргея Вітушкі**: Swedbank GEDIMINO, 26 VILNIUS LT52 7300 0100 0176 4423

Напісаць **Сяргею Вітушку** можна на адрас: **talakoviec@tut.by**

Беларуская Нацыянальная Памяць пачала збор сродкаў сярод беларусаў Польшчы. Пачатак быў пакладзены на беларускай дыктоўцы 21 лютага, сабрана 312 злотых. Учора, 25 лютага, два беларускія студэнты зь Беластоку перадалі на друк кнігі 80 злотых. На сёньня агулам маем 392 злотых. Грошы можна пераслаць непасрэдна на рахунак, альбо перадаць праз БНП, калі Вы ў Польшчы. Мы будзем падаваць суму сабраных ахвяраванняў на нашай старонцы **Беларуская Нацыянальная Памяць**.

## Сьвятаваньне 25 Сакавіка ў Бэльгіі

25 сакавіка аб 11 гадзіне раніцы ў Беларускай Грэка-Каталіцкай Царкве гораду Антвэрпану распачалася сьвяточная літургія з нагоды сьвяткаваньня Сьвята Дабравешчаньня і Дня Незалежнасьці Беларусі.



Па традыцыі беларусамі Бэльгіі і Францыі была арганізаваная паездка і ўскладаньне кветак да магілы Міколы Равенскага ў Лювэне.



Потым Сьвята прадоўжылася ў гістарычным цэнтры гораду Брусэлю. Актывістамі Беларуска-Эўрапейскага Задзіночаньня было распаўсюджана больш за тры сотні інфармацыйных ўлётак з інфармацыяй аб Беларускім Сьвяце.

Да сьвяточнай акцыі ў Брусэлю таксама далучыліся кіраўнікі незалежных прафсаюзаў Беларусі. Мінакі й турысты на ўспамін аб сьвяце атрымалі гелевыя балёнікі, вытрыманыя ў беларускіх нацыянальных колерах.

Пасьля сьвяточнай акцыі ў Брусэлі, беларускія палітычныя ўцекачы завіталі да Раднага БНР спадара Янкі Жучкі, каб павіншаваць з найвялікшым беларускім Сьвятам.

Падчас сьвяточнага застольля было зачытана віншаваньне Старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі спадарыні Івонкі Сурвілы.

**Крыніца:** Старонка Беларуска-Эўрапэйскага Задзіночаньня http://www.bielarus.eu

## Беларусь у сьвеце

# 125 ГАРАДОЎ ПА ЎСІМ СЬВЕЦЕ ЗА СВАБОДНУЮ БЕЛАРУСЬ

Уначы 18 сакавіка 2010 года Маладыя Эўрапейскія Федэралісты (JEF) і шматлікія партнёры па ўсім сьвеце пратэставалі супраць апошняй дыктатуры Еўропы на чацьвёртыя ўгодкі сумнеўных прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі. Пятая штогадовая акцыя «Свабодная Беларусь» адбылася ў 125 гарадох на чатырох кантынэнтах, уключаючы гарады амаль ва ўсіх еўрапейскіх краінах, нават у Беларусі!

Спецыяльная вулічная акцыя Маладых Эўрапейскіх Федэралістаў сабрала маладых людзей, якія завязвалі рот статуям і адзін аднаму і пазіравалі з расьцяжкамі «Дайце голас народу Беларусі!», пратэстуючы супраць дыктатуры Лукашэнкі, які пазбавіў 10 мільёнаў грамадзян Беларусі фундамэнтальных правоў чалавека, у прыватнасьці, права на свабоду слова.

“Свабодная Беларусь значыць: калі Беларусь вольная ад сьмяротнага пакараньня, вядомая павагай да правоў чалавека, свабода слова распаўсюджваецца на ўсіх грамадзян, ёсьць свабода прэсы і няўрадавых арганізацыяў, а таксама працэс свабоднага абраньня лідэра на выбарах сапраўды дэмакратычны — толькі тады мы можам казаць пра аб'яднаную, моцную і справядлівую Эўропу, — кажа прэзідэнт JEF-Europe Філіп Адрыянсэнс. — Эўрапейскі саюз, у які верыць JEF, — той, які мае ясную зьнешнюю палітыку, а ня той, які зачыняе вочы на парушэньні правоў чалавека, якія адбываюцца ў яго на парозе”.




“Дзеяньні гучнейшыя за словы, — працягвае каардынатар акцыі «Свабодная Беларусь» Элізабет Вэлле. — Усё ж кожны год мы спадзяемся, што гэта будзе апошні раз, калі мы вымушаныя ладзіць гэту акцыю. Асуджаць рэжым недастаткова. Эўрапейскі саюз павінен зрабіць усё магчымае, каб падтрымаць грамадзянскую супольнасьць у межах Беларусі, каб запэўніцца, што наступныя галоўныя выбары пройдуць пад наглядам назіральнікаў і гарантуюць свабоду прэсы і палітычнага меркаваньня. Больш за тое, гэта час для адмены прыпыненьня санкцыяў супраць Лукашэнкі і яго чыноўнікаў. Эўропа павінна даць зразумець, што яе базавыя каштоўнасьці не дазволяць ціха дапускаць парушэньні правоў чалавека, і што яна ніякім чынам не падтрымлівае беларускую дыктатуру”.

“Мы прызываем віцэ-прэзідэнта Эўрапейскай камісіі, вярхоўнага прадстаўніка па замежных справах і палітыцы бясьпекі Кэтрын Эштан спрыяць большаму супрацоўніцтву ; паміж дзяржавамі ЕС і еўрапейскімі інтстытутамі і дапамагаць Еўропе ў вызваленьні беларусаў ад дыктатарскай улады. Такім шляхам можа рухацца Беларусь, каб далучыцца да дэмакратычных дзяржаваў Эўропы”, — падагульніў Філіп Адрыянсэнс.

---

# Пасланьне старшыні Рады БНР Івонкі Сурвіллы з нагоды Дня волі

Дарагія суродзічы-беларусы!

Ад імя Рады Беларускай Народнай Рэспублікі вітаю Вас з нашым вялікім нацыянальным сьвятам – Днём волі, і жадаю Вам правесьці яго зь верай і надзеяй на лепшую будучыню. Беларускі народ даможацца волі і дэмакратыі, так як дамогся незалежнай дзяржавы.



У вольным сьвеце мы ведалі, што ніякае зло не можа быць вечным. Чыталі Трэцюю ўстаўную грамату Рады БНР, якая абвяшчала незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі і верылі, што калі ў 1918 годзе ў такіх цяжкіх умовах наш народ здолеў выказаць сваё жаданьне быць вольным між вольнымі народамі сьвету, дык ён знойдзе ў сабе сілы перацярпець зьдзек і няволю савецкіх часоў ды адродзіць зноў сваю незалежную дзяржаву.

Сёньня хацела б падзяліцца з Вамі вытрымкай з Трэцяй устаўной граматы, якую ўважаю асабліва натхняльнай:

*Цяпер мы, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, скідаем з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасьці, якое гвалтам накінулі расейскія цары на наш вольны і незалежны край. Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнаю вольнаю дзяржавай. На моцы гэтага трацяць сілу ўсе старыя дзяржаўныя зьвязі, якія далі магчымасьць чужому ўраду падпісаць і за Беларусь трактат у Берасьці, што забівае на сьмерць беларускі народ, дзелячы зямлю яго на часткі.*

Дарагія суродзічы! Памятайма гэтыя словы. Толькі свая незалежная вольная дзяржава абароніць край ад захопніцкіх замахаў на яго, зь якіх бы бакоў яны ня йшлі. Толькі дэмакратычны ўрад здолее забясьпечыць народу мірную вонкавую палітыку. Толькі свая ўлада выратуе ад заняпаду і нішчэньня нацыянальную мову і культуру.

З глыбіні сэрца жадаю Вам вытрываласьці, любові да свайго прыгожага краю, веры ў будучыню і мужнасьці, якая характарызуе ўсіх вольных духам людзей. Прыдзе час, калі наш народ будзе сьвяткаваць сваё вялікае сьвята незалежнасьці і свабоды ды з гонарам успамінаць продкаў, якія 25 сакавіка 1918 году скінулі з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасьці.

Жыве Беларусь!

## Уладзімір Арлоў - лаўрэат прэміі “Эўрапэйскі Паэт Свабоды”

Прэмія, заснаваная муніцыпалітэтам польскага гораду Гданьск, была ўручана сёньня ўвечары ў Польшчы.

Беларуская студэнтка Святлана Панкавец, якая прымала ўдзел ва ўзнагароджваньні, кажа, што спачатку ў музычным суправаджэньні чыталі выбраныя вершы кожнага з намінантаў. А пасьля мэр Гданьска разам з старшынёй журы ўручыў прэмію лаўрэату — Уладзіміру Арлову.

Журы амаль аднагалосна выказалася за перамогу беларускага пісьменьніка.



фота trojmiasto.gazeta.pl

Арлоў у сваім слове падзякаваў усім, і адзначыў, што Беларусі ў параўнаньні з Польшчай яшчэ трэба пазмагацца за сваю свабоду.

Уладзімір Арлоў прадстаўляў Беларусь на агульнаеўрапэйскім конкурсе «Эўрапэйскі паэт свабоды» з кнігай вершаў «Паром праз Ла-Манш». Сярод намінантаў былі паэты з Польшчы, Кіпра, Славаччыны, Славеніі, Сэрбіі, Францыі, Швэцыі.

З сарака шасьці эўрапэйскіх краін для ўдзелу былі выбраныя восем. З кожнай краіны-фіналіста выбралі па адным паэце, чыю кніжку пераклалі і выдалі па-польску. Кнігу Арлова пераклаў паляк Адам Паморскі.

Лаўрэата чакае прэмія ў памеры 100 000 злотых.

**Крыніца:** *Наша Ніва*, 26 сакавіка 2010

# СПОРТ

## Беларусы заваявалі срэбра і бронзу на Алімпіядзе

Чацьвер, 18 лютага, стаў шчасьлівым днём для беларускіх спартсменаў і наагул беларускіх заўзятараў. Нашы біятлaністы заваявалі адразу два медалі на Зімовых Алімпійскіх гульнях.

Напачатку ў індывідуальнай гонцы ў Уістлеры **Дар’я Домрачава** заваявала бронзу.

**Сяргей Новікаў**, які ня лічыўся фаварытам гонкі заваяваў срэбра. Ён прабег дыстанцыю за 48 хвілін 32 секунды, не зрабіўшы ніводнага промаху. Такі ж вынік паказаў і нарвежац Оле-Эйнар Б’ёрндален, які, праўда, двойчы спудлаваў.

Але і Сяргей Новікаў, і Оле-Эйнар Б’ёрндален атрымаюць сярэбраныя медалі.

**Крыніца:** Радыё Рацыя, 19 лютага 2010

## Аляксей Грышын заваяваў залаты медаль Алімпіяды-2010

30-гадовы беларускі фрыстайліст Аляксей Грышын заняў першае месца ў фінале алімпійскіх спаборніцтваў ванкуверскай Алімпіяды. Гэта першы залаты медаль беларускіх спартсменаў за час выступленьня на зімовых Алімпійскіх гульнях самастойнай камандай.




Па суме двух скачкоў Грышын набраў 248,41 бала. "Серабро" атрымаў амэрыканец Джэрэт Петэрсан (247,21), "бронзу" — кітаец Лю Чжунцын (242,53). Цімафей Сьлівец заняў дзявятае месца (225,58), Дзьмітры Дашчынскі — 11-е (215,68) сярод 12 удзельнікаў.

**Крыніца:** Хартыя 97, 26 лютага, 2010

**КРЫВІЯ - Культурна-асьветніцкая газэта**

Выданьне беларускай дыяспары ў Чэхіі

MK ČR E 16919

РЭДАКЦЫЯ

Юрка Станкевіч

Ганна Васілевіч

Адрас рэдакцыі:

ul. Ostrovského 253/3, 150 00 Praha 5